ленчасць асацыятыўнага тыпу засн. на слыхавым успрыманні муз. гукаў ва ўзаемасувязі з рознымі пазагукавымі з'явамі (дынамічнымі, каларыстычнымі, аптычнымі). Асацыятыўны Г. часта выступае як элемент праграмнай музыкі, дзе загалоўкі і рэмаркі канкрэтызуюць вобразны змест. На практыцы імітацыйны і асацыятыўны Г. часта аб'ядноўваюцца (харэагр. навела «Мушкецёры» Я.Глебава). Вялікае значэнне ў Г. маюць дынаміка, рэгістры, тэмбры інструментаў («светлыя» і «цёмныя», «бліскучыя» і «цьмяныя»), а таксама гука-колеравыя асацыяцыі. З узнікненнем электроннай музыкі (муз. камп'ютараў, сінтэзатараў і інш. электронна-муз. канструкцый) у Г. шырока выкарыстоўваюцца новыя гукавыяўл. эфекты, незвычайныя, «незямныя», «касмічныя» гучнасці (напр., выкарыстанне дыму, які рассейваецца ў спектаклі «Не мой» Б.Герлавана).

*Ю.В.Пацюпа* (паэзія), *Н.А.Юўчанка* (музыка).

**ГУКАРАД**, 1) пэўная паслядоўнасць усёй сукупнасці гукаў канкрэтнай муз. або гукавой сістэмы, якія размешчаны ва ўзыходзячым або нісходзячым руху. 2) Гарманічны рад, або паслядоўнасць абертонаў (аліквот, гарманічных прыгукаў), — акустычна ўпарадкаваны спектр інтэрвалаў, які стварае адзіны муз. гук (т.зв. натуральны Г.). 3) Паслядоўнасць гукаў, якая фіксуе аптымальны выканальніцкі дыяпазон (аб'ём) пэўнага інструмента (напр., гукарад ад мі$^1$ да соль$^3$ у кларнета). 4) Схематычны выгляд тонаў лада (напр., мажорнага). 5) Агульны састаў гукаў (5-ступенны — пераважна ў кітайскай музыцы, 7-ступенны — у еўрап. музыцы і 12-ступенны) дадзенага строю (напр., раўнамерна-тэмпераванага) або сукупнасць гукаў муз. твора, якая выпісана ў паступальным парадку (1-я, 2-я, 3-я ступені і г.д.). 6) Гукавая структура пэўнага інтэрвальнага роду — дыятанічнага, геміёльнага, міксадыятанічнага, мадальнага (напр., сіметрычны Г. А.Месіяна). 7) Важнейшы крытэрый абіходных ладоў. Асаблівасць абіходнага Г. заключаецца ў тым, што ад кожнай з яго гукаступеняў, якая рухаецца ўверх ці ўніз, заўсёды знаходзіцца інтэрвал чыстай кварты, а агульная гукарадная сістэма з'яўляецца міксадыятанічнай (напр., стараж.-слав. манодыя, праваслаўная пеўчая культура). Адзін і той жа Г. можа прадстаўляць розныя ладаствярэнні і выконваць канкрэтную ролю ў розных тыпах муз. кампазіцыі (напр., канструкцыйную ў серыйнай дадэкафоніі). Як упарадкаваны комплекс гукаў Г. набліжаецца да гамы (мажорнай, мінорнай, храматычнай, падгалянскай, гамы М.Рымскага-Корсакава і г.д.). Гукавы матэрыял твора вызначаецца канкрэтна-гіст. умовамі бытавання музыкі, яе зместам, сац.-дэтэрмінаванымі формамі музіцыравання.

*Т.Г.Мдывані.*

**ГУКІ БЕЛАРУ́СКАЙ МОВЫ**, комплексы артыкуляцыйных рухаў і іх акустычны эфект, якія фарміруюць фанацыйную абалонку значымых адзінак бел. мовы. Утвараюцца ў выніку маўленчай дзейнасці чалавека і ўспрымаюцца яго слыхавой сістэмай. Апісанне артыкуляцыйна-акустычных асаблівасцей асобных гукаў умоўнае, паколькі мін. вымаўленчай адзінкай з'яўляецца склад. Гук вылучаецца са складу на падставе ўяўленняў чалавека пра фанемны састаў дадзенага склада, слова. У бел. літ. мове 45 гукаў (39 зычных і 6 галосных), якія складаюць яе гукавую сістэму і могуць вывучацца ў 3 аспектах: артыкуляцыйным (анатама-фізіялагічным), акустычным, функцыянальным.

Артыкуляцыйна кожны гук утвараецца ў выніку складаных рухаў маўленчых органаў. Пры артыкуляцыйнай класіфікацыі Г.б.м. падзяляюцца на галосныя і зычныя. Пры вымаўленні галосных пераважае голас, або муз. тон, пры вымаўленні зычных значнае месца займае шум. Галосныя гукі адрозніваюцца паводле ўдзелу губ у іх вымаўленні (лабіялізаваныя: [о], [у]; нелабіялізаваныя: [і], [ы], [э], [а]), паводле ступені пад'ёму языка (верхняга пад'ёму: [і], [ы], [у]; сярэдняга: [э], [о]; ніжняга: [а]), паводле месца пад'ёму языка (пярэдняга рада: [і], [э]; сярэдняга: [ы], [а]; задняга: [о], [у]). Пры артыкуляцыйнай класіфікацыі зычных гукаў улічваюцца суадносіны голасу і шуму, спосаб утварэння, месца ўтварэння, цвёрдасць (велярызацыя), мяккасць (палаталізацыя). Паводле ўдзелу голасу і шуму зычныя падзяляюцца на шумныя (складаюцца з шуму, які пераважае над голасам, — звонкія: [б], [б'], [г], [г'], [g], [g'], [з], [з'], [ж], [дж], [дз], [дз'], [д] або толькі з шуму — глухія: [к], [к'], [п], [п'], [с], [с'], [ш], [х], [х'], [ч], [ф], [ф'], [т]) і санорныя (голас пераважае над шумам: [в], [в'], [ў], [м], [м'], [н], [н'], [л], [л'], [р], [й]). У параўнанні з шумнымі санорныя не ўтвараюць пар па звонкасці-глухасці, не асімілююцца па глухасці, не аглушаюцца на канцы слова, не ўплываюць на глухія зычныя, што стаяць перад імі, і не змяняюцца перад санорнымі на звонкія. Паводле спосабу ўтварэння зычныя падзяляюцца на змычныя, або выбухныя (органы маўлення змыкаюцца, утвараючы перашкоду на шляху паветра, якое потым прарывае змычку: [б], [б'], [п], [п'], [д], [т], [g], [g'], [к], [к']), шчылінныя, або фрыкатыўныя (органы маўлення зблізкаюцца, утвараючы шчыліну, праходзячы праз якую, паветра ўтварае шум: [з], [з'], [с], [с'], [ж], [ш], [г], [г'], [х], [х'], [в], [в'], [ў], [й], [ф], [ф']), змычна-шчылінныя, або афрыкаты (органы маўлення спачатку змыкаюцца, утвараючы поўную змычку, пасля чаго плаўна размыкаюцца: [дз], [дз'], [дж], [ч], [ц], [ц']), змычна-праходныя (адны органы маўлення змыкаюцца, а другія ўтвараюць праход для паветра: [м], [м'], [л], [л'], [н], [н']), дрыжачыя (утвараюцца пры дрыжанні канца языка, які шматразова дакранаецца да паднябення і тым самым стварае перашкоду на шляху паветра: [р]). Месца ўтварэння зычных гукаў вызначаецца актыўнымі

(губы, язык) і пасіўнымі (зубы, розныя часткі паднябення) органамі. Па месцы ўтварэння адрозніваюць 2 групы зычных — губныя (лабіяльныя) і язычныя. Паводле актыўнай або пасіўнай пазіцыі органаў артыкуляцыйнага апарату губныя падзяляюцца на губна-губныя (білабіяльныя): [б], [б'], [п], [п'], [м], [м'], [ў] і губна-зубныя (лабіяльна-дэнтальныя): [в], [в'], [ф], [ф']. У залежнасці ад таго, якая частка языка прымае ўдзел ва ўтварэнні гукаў, вылучаюць зычныя пярэднеязычныя ([т], [д], [с], [с'], [з], [з'], [ц], [ц'], [ж], [ч], [дж], [дз'], [н], [н'], [р], [л], [л']), сярэднеязычныя ([й]) і заднеязычныя ([г], [г'], [g], [g'], [к], [к'], [х], [х']). Паводле пасіўнага органа адрозніваюць гукі зубныя ([д], [т], [с], [з], [ц], [дз], [н], [л], [л'], [р]) і паднябенныя (пярэднепаднябенныя: [с'], [з'], [ц'], [дз'], [н'], [ж], [ш], [дж], [ч]; сярэднепаднябенныя: [й], [г'], [g'], [к'], [х']; заднепаднябенныя: [г], [g], [к], [х]). Па наяўнасці або адсутнасці палаталізацыі (дадатковай сярэднеязычнай артыкуляцыі) зычныя падзяляюцца на мяккія (палаталізаваныя) і цвёрдыя (непалаталізаваныя). Большасць зычных сучаснай бел. мовы ўтвараюць пары па цвёрдасці і мяккасці: [б] — [б'], [п] — [п'], [д] — [дз'], [т] — [ц'], [з] — [з'], [с] — [с'], [в] — [в'], [ф] — [ф'], [м] — [м'], [н] — [н'], [л] — [л'], [г] — [г'], [g] — [g'], [к] — [к'], [х] — [х']. Не мае адпаведнага цвёрдага гук [й] (для якога сярэднеязычная — палатальная — артыкуляцыя з'яўляецца асноўнай), адпаведны мяккі адсутнічае ў гука [ў]. У асобную групу вылучаюцца зацвярдзелыя зычныя [ж], [ш], [дж ], [ч], [р], [ц].

Акустычныя характарыстыкі гукаў залежаць ад асаблівасцей крыніцы гука, памераў і формы надгартанных поласцей, што адыгрываюць ролю рэзанатараў. Да асн. акустычных асаблівасцей гукаў адносяцца сіла, вышыня, працягласць і тэмбр. Сіла (інтэнсіўнасць) гука залежыць ад амплітуды ваганняў, на якую ўплывае напор струменя паветра: чым меншая амплітуда, тым менш моцны гук. Вышыня гука вызначаецца колькасцю ваганняў у секунду і залежыць ад даўжыні галасавых звязак; чалавек здольны ўспрымаць ваганні ад 16 да 20 000 Гц. Працягласць гука залежыць ад часу яго вымаўлення. Сярод галосных найб. працяглымі з'яўляюцца націскныя, а сярод зычных — шчылінныя [в], [в'], [ў], [ф], [ф'], [ж], [ш], [з], [з'], [с], [с'], [х], [х'] і інш. Тэмбрам называецца спецыфічная афарбоўка, якая дазваляе адрозніваць тоны адной і той жа сілы і вышыні.

Функцыянальныя асаблівасці галосных гукаў у адрозненне ад зычных прадвызначаюцца іх складаўтваральнай роляй у маўленні.

*Літ.:* Падлужны А.І., Чэкман В.М. Гукі беларускай мовы. Мінск, 1973; Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983; Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989; Вэкслер П. Гістарычная фаналогія беларускай мовы. Мінск, 2004. Д.В.Дзятко.

**«ГУЛА»**, беларуская народная гульня. У яе аснове — спаборніцтва 2 каманд па кіданні-качанні кола як найдалей. Для ўсіх рэгіёнаў дзеянне «Г.» амаль аднолькавае. Фалькларысты фіксавалі пераважна адрозненні ў назвах: «Качанне кружка» (Навагрудчына), «Качалка» (Гродзеншчына), «Катанне кулі» (Глыбоччына), «Гула» (Бярэзіншчына), «Була» (Магілёўская і паўд. раёны Мінскай абласцей), «Заганяка» (Вілейшчына) і інш. Гульцы дзяліліся на каманды ад 3 да 15—20 чал. у кожнай. Кіраўнікамі выбіралі самых дужых, іх называлі асілкамі, большымі, капітанамі, астатніх — абаронцамі, дружкамі, памагатымі ці проста гульцамі. Асн. атрыбутам «Г.» было кола ці круглы прадмет (камень, металічны шар і г.д.), які мог каціцца па зямлі. Для трываласці часам выкарыстоўвалі больш моцнае кола ад воза ці металічны абручык ад яго. Адзін з гульцоў кідаў кола ў бок каманды сапернікаў, якая ў сваю чаргу старалася як мага хутчэй спыніць яго і такім жа чынам адправіць назад. Адна каманда наступала, другая — адступала. Гульцам дазвалялася падыходзіць толькі да таго месца, дзе спынялася кола. Для яго спынення можна было ўжываць палкі, дошкі, ватоўкі і інш. Перамагала тая каманда, якая «заганяла» сваіх сапернікаў да загадзя дамоўленага месца. Гульня лічылася небяспечнай.

*Літ.:* Гульні, забавы, ігрышчы. Мінск, 1996. А.Ю.Лозка.

**ГУЛАК** (Hulak) Яраслаў (10.9.1920, г. Прахаціцы, Чэхія — 6.8.1999), чэшскі перакладчык. Скончыў Карлаў ун-т (1945). Працаваў у выд-ве «Млада фронта». З 1952 займаўся выключна перакладамі твораў слав. л-р. На чэшскую мову пераклаў раман «Мінскі напрамак» І.Мележа, аповесці «Абеліск», «Дажыць да світання», «Знак бяды», «Праклятая вышыня», «Кар'ер» В.Быкава. Аўтар кн. вершаў «У часе дванаццатым» (2008), прадмоў і пасляслоўяў да перакладзеных кніг. *А.У.Вострыкава.*

**ГУЛЕ́ВІЧ** Пятро Восіпавіч (1870, в. Рудня Чачэрскага р-на — 28.5.1957), беларускі казачнік. Расказваў казкі, перанятыя ад аднавяскоўцаў, а таксама ад укр. казачнікаў. Творча распрацоўваў традыц. сюжэты. Пры дапамозе жывой гутарковай мовы, спалучаючы апавядальную і дыялагічную формы, ствараў трапныя характары персанажаў у анекдатычных казках «Штукар», «Салдацкая загадка», «Разумны мужык» і інш. На бел. мове расказваў рус. нар. казкі пра Еруслана Лазаравіча, Баву Каралевіча і Ілью Мурамца. Восем выбраных тэкстаў яго казак склалі асобную кн. «Беларускія казкі, запісаныя ад Пятра Гулевіча» (1963).

**ГУЛЕ́ВІЧ** Станіслава Іосіфаўна (н. 25.5.1925, в. Рудня-Стаўбунская Веткаўскага р-на), беларуская артыстка оперы (мецца-сапрана). Засл. артыстка Беларусі (1976). Скончыла Бел. кансерваторыю (1956). З 1956 салістка Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі, з 1965 — Бел. філармоніі. Валодае голасам прыгожага, цёплага